МАСТОЎСКАЯ РАЁННАЯ ГАЗЕТА

# Зара над Нёманам

www.mosty-zara.by

ГАЗЕТА ВЫДАЕЦЦА З 1945 ГОДА

№58 (8868)

СУБОТА, 1 жніўня 2015 года

Цана 1800 руб.

Святая справа – вырасціць хлеб. Зямля дае багаты ўраджай, калі за ёй як след даглядаюць, не ведаючы адпачынку і спакою, пакуль апошні каласок не будзе абмалочаны. Калі праехаць уздоўж палёў, то заўважыш, як зернеўборачныя камбайны, нібыта караблі, плывуць па залатым моры спелых каласоў. Грузавыя аўтамабілі адвозяць сабраны ўраджай на зерняток, дзе яго, калі трэба, дасушаць і захаваюць. Такім чынам, можна зрабіць высноў, што на гэты хлеб працавала вельмі шмат людзей, і ўборка збожжа заўсёды была і застаецца вянцом працы і стварэння вяскоўцаў на працягу года. Гэта ўдвая прыемна, калі яна суправаджаецца песнямі і абрадамі.

Раней, як і цяпер, да пачатку жніва рыхтаваліся як да вялікага свята. Гаспадыня мыла дом, гаспадар прыбіраў двор і гумно. Стол засцілаўся белым абрусам. Перад пачаткам жніва кожны гаспадар ці гаспадыня хадзілі і аглядалі ніву: ці паспеў колас, ці пара жаць. Самую першую зжатую жменю жняя клала не ў сноп, а на полі разам з хлебам і сырам. Потым пачыналі жаць першы сноп –"гаспадарок". Ён упрыгожваўся і захоўваўся ў хаце ў чырвоным покуце пад іконай.

У кожнай гаспадарцы Мастоўшчыны старт «Зажынкам» даў кіраўнік. Уключыліся ў гэту працу і работнікі культуры. Перад пачаткам выхаду камбайнаў у поле работнікі культуры спявалі абрадавыя песні, якія ўшаноўваюць нялёгкую, але такую патрэбную і пачэсную працу хлебароба, пажадалі добрага надвор'я і натхнялі на працоўны лад. Яны на працягу ўборачнай кампаніі будуць падтрымліваць працаўнікоў сяла песнямі. А па выніках жніва ў кожнай гаспадарцы правядуць «Дажынкі».

Па народных прыкметах, калі на «Зажынкі» свеціць сонейка, гэта значыць, што будзе добры ўраджай. А менавіта ў гэты дзень свяціла сонейка, і мы жадаем аграрыям нашага раёна добрага надвор'я і каб задуманыя планы збыліся.

**С. ДЗЕЙКАЛО**

# Культура на жніве



Вякамі нашы продкі жалі сярпамі збажыну. Разам з усімі жанчынамі выходзіла жаць у поле і мая мама. Я, як і ўсе вясковыя дзеці, умеў вязаць снапы, ставіць іх у дзесяткі. У сярэдзіне 60-х гадоў мінулага стагоддзя, калі ў калгасы паступіла па некалькі камбайнаў, жнейкі перасталі выходзіць з сярпамі ў поле.

Цяпер многія нават не бачылі, як жнуць жыта ці пшаніцу сярпамі. Але, па даўняй традыцыі, першы сноп заўсёды зажынаецца сярпом, і заўсёды гэта робіць паважаная ў вёсцы жанчына. Раней ён уручаўся гаспадару, старэйшаму і самаму аўтарытэтнаму ў вёсцы чалавеку. Зараз ён таксама ўручаецца гаспадару, кіраўніку гаспадаркі, упрыгожваецца і захоўваецца да новага ўраджаю.

Заўсёды ў час дажынак гучаць і жніўныя песні. Кранула за душу гэты абрад у ААТ "Чарлёна" ў выкананні народнага ансамбля народнай песні "Багатуха" пад кіраўніцтвам А. М. Вілінскай. І сама Алена Мікалаеўна, і Вольга Канстанцінаўна Варабей, Вольга Аляксандраўна Аврук, Юлія Іванаўна Сільвон, Лізавета Дзмітрыеўна Вілінская, Таццяна Аляксандраўна Даўгайла стварылі незабыўную атмасферу добрага настрою, жаданне сабраць без страт багаты ўраджай, гучалі пажаданні здароўя для тых, хто ў полі і іх блізкім (на верхнім здымку).

Добрыя традыцыі нашых продкаў працягваюць Вольга Юр'еўна Вайтовіч і Вольга Мікалаеўна Альховік з Мастоўскага раённага цэнтра рамёстваў. Яны працуюць майстрамі па саломапляценню. Жаданне займацца гэтай справай у іх таксама ўзнікла ў дзяцінстве. Выдатныя рэчы вырабляюць яны з саломы, хоць для гэтага трэба мець немалое цярпенне і ўмельства.

І яны свой першы сноп зажынаюць урачыста, каб ладзілася праца, прыносіла добры плён. В. Ю. Вайтовіч і В. М. Альховік (на ніжнім здымку) таксама радуюцца багатаму ўраджаю зерневых, які паспеў на палетках раёна.

**С. ЗВЯРОВІЧ**
**Фота аўтара**



**Больш 15 тысяч гектараў займае зерневая ніва на Мастоўшчыне. Ураджай на гэты год добры: у межах 50 цэнтнераў з гектара. А ёсць участкі і па 70 цэнтнераў.**

Працяг тэмы на 2-3-й старонках

Взгляд изнутри

# В библиотекари пойду, пусть меня научат!

**Многие девушки-книголюбы в детстве мечтали стать библиотекарями, чтобы читать на рабочем месте целые дни напролёт и нести «прекрасное» в массы. Но потом они подросли, и у большинства взлелеянные мечты оказались неосуществимыми. А еще в библиотеки мало ходят – все давно в интернете. Чтобы узнать, так ли это, я решила один день провести в библиотеке.**

**Районная библиотека города Мосты подарила возможность окунуться в мир таинств, пообщаться с креативными сотрудниками и узнать, есть ли во всем вышеописанном хоть доля правды, почему они выбрали эту профессию и какова она изнутри.**



Библиотекари отдела обслуживания и информации Мостовской районной библиотеки (слева направо) Г. Н. МИКАНОВА и О. А. ЛЕВЧИК.



Библиотекари Мостовской районной детской библиотеки И. Р. ДЕМЕЩИК и С. И. ЛАЗАРЕНКО знакомят постетителей А. ФИЛАНОВИЧА и К. ЛЮЦКЕВИЧ с литературой.
Фото С. ЗВЕРОВИЧА

## О чём шепчет история?

Каждый день проходим мимо библиотеки, довольно часто заходим за литературой, но даже и не догадываемся, как формировался её статус. Чем дышит библиотека и что делают её сотрудники, а ещё бы познакомиться со структурой и основными направлениями учреждения культуры. Это мы и попытались узнать. Не всем известно, но Мостовская районная библиотека была основана в 1939 году. В 1978 году была проведена централизация библиотек и организована централизованная библиотечная система. А уже в сентябре 2014 года создано государственное учреждение культуры "Мостовская районная библиотека". В его состав входят три городские библиотеки: Мостовская районная библиотека, Мостовская районная детская библиотека и Мостовская городская детская библиотека. Помимо этого, в районе еще 15 сельских библиотек.

## Теория больших дел

-- В 1989 году я поступала учиться. И сравнивать тогда и сейчас профессию библиотекаря – это совершенно разные вещи. Всё изменилось: и компьютеры, и интернет, но это не заменяет, конечно же, книгу. И если говорить цитатой из фильма "Москва слезам не верит": "Сейчас будет кино и не будет театра", тоже не совсем верно. Ведь есть и то, и другое, также и с книгой. Библиотеку посещают, она востребована. Бывает, люди говорят: "Вот мы приходим, и мало читателей встречаем". Хочется провести эксперимент: закрыть дверь и ждать. Всё равно люди будут приходить, дёргать дверь без конца, - рассказывает Татьяна Иосифовна Стельмах, директор районной библиотеки.

-- Работа в библиотеке сейчас перестраивается. Если раньше читатели в читальном зале занимались исключительно здесь, то теперь книги выдаются на дом, но за определённую плату. Более восьми лет колесит по дорогам района внестационарный пункт обслуживания населения книгой – "Библиобус". В среднем, выезжает 2-3 раза неделю, но в одной конкретной деревне бывает раз в месяц. Помимо выдачи литературы, проводим и массовые мероприятия, акции, обзоры, консультации и тематические выставки, - продолжает Татьяна Иосифовна.

На первом этаже находится "взрослая" библиотека, а на втором – детская. Одно из новшеств детской библиотеки – это игровая комната. Здесь проходят дни рождения, мероприятия, конкурсы.

## Всё решено, или С большим планом!

Путешествие по библиотеке начинается. Стаж работы большинства сотрудников достигает порядком тридцати лет. Это колоссальный труд и опыт. Столько лет отдать библиотеке – она как второй дом для сотрудников. Отдел комплектования, обработки и организации единого фонда: первоначально сюда поступают все книги. Они проходят сверку: им присваивается инвентарный номер, запись о книге вносится в электронный каталог. А затем уже поступают на полки стеллажей. Заведует этим отделом Алла Михайловна Довгун.

А вот в соседнем кабинете работает художник-оформитель Галина Иосифовна Василевская. Её руками и талантом оформлены все библиотеки в Мостовском районе.

Интересным фактом является то, что в 2002 году Мостовская районная библиотека -- первая в республике -- получила право на использование и прокат лицензионных видеокассет и дисков.

Заходишь в библиотеку и сразу замечаешь выставки, которые оформляются к каждому празднику, музейные экспонаты, которые расположились вдоль стены в читальном зале на первом этаже. Часть экспонатов выставки времен войны предоставили музеи, часть принесли работники из дома. Книги, письма-треугольнички, плакаты, газеты– всё это можно найти на полках развёрнутой выставки, сделанной своими руками сотрудниками библиотеки. Приглашаются на мероприятия ветераны и узники, они делятся своими переживаниями, эмоциями с людьми, рассказывают о жизни и дают советы на будущее.

Детская библиотека проводит различные конкурсы для детей разных возрастов. Сотрудники привлекают внимание своих читателей и дают возможность принять участие в жизни библиотеки. Ребята получают задания на всё лето, выполняют их, а 1 сентября на линейке происходит награждение победителей конкурса "Лето и книга".

## В поисках смысла

Мы успели пообщаться с сотрудниками библиотеки. Они рассказали о выборе профессии, своих интересах и мечтах в детстве.

**Татьяна Збигневна ЯРОШУК, заведующая Мостовской районной детской библиотекой:**

-- У меня опыт работы в библиотеке уже около двадцати лет, двенадцать из которых я проработала в сельской библиотеке. Может, это и банально, но я мечтала в детстве о нарядах, бантиках, как и все девочки. Так получилось, что стала библиотекарем. Ни капельки не жалею о сделанном выборе, поскольку я очень люблю детей. А моя работа позволяет мне быть в постоянном окружении маленьких «цветочков». Пользуется популярностью проведение дней рождений: если в прошлом году их было 25, то в этом только за полгода – 28. Наблюдаю за своими детьми, как и что им лучше нравится, а затем и использую такие методы с другими малышами. Главное, что всем нравится.

**Людмила Иосифовна ПОКАТИЛО, заведующая отделом обслуживания и информации Мостовской районной библиотеки:**

-- Я работаю в библиотеке с 1979 года. Окончила Белорусский государственный университет культуры и искусств. Когда пришла сюда, то пропагандировали классиков двадцатого века. Сейчас же всё иначе. Люди интересуются совершенно разными книгами. Особенно тяжело преподносить литературу молодёжи. Необходимо перестраиваться, понять всю психологию, чтобы было им интересно и востребовано. Ведь у молодёжи теперь иные интересы. А профессия библиотекаря очень интересная, постоянно среди книг и людей. И даже если ты чего-то не знаешь, то читатели подскажут.

Желание ходить в библиотеку, приводить друзей или детей – всё это приходит с годами, как говорится. И всё-таки мнение о том, что библиотекари целыми днями читают книги на рабочем месте – далеко не так. Чтобы взять в руки сборник рассказов любимого автора, необходимо выполнить много работы и обслужить читателей. Весь коллектив приятный и очень добрый. Теперь я понимаю, что во всём том, что происходит в библиотеке, лучше хотя бы один раз поучаствовать, чем сто раз услышать!..

*P.S. Вечером узнала: в тот день библиотеку посетило больше ста человек.*

**А. МАКАР**



Летні адпачынак

# Як я стала маці і старэйшай сястрой на 18 дзён





Калі я была школьніцай, кожнае лета адпачывала ў дзіцячых аздараўленчых лагерах. Было весела і запамінальна! Гэтым летам мне захацелася зноў паехаць у лагер, толькі цяпер ужо не на адпачынак, а на працу.

Сябры вельмі здзівіліся, калі даведаліся пра маё жаданне. "Навошта табе гэта?", "Праца з дзецьмі не тое ж самае, што сабаку выгульваць, разумееш?", "Ну і які з цябе педагог?" – даводзілася чуць мне. Але жаданне спазнаць новае, паспрабаваць свае сілы ў іншай сферы дзейнасці было моцным, у дадатак, захацелася даказаць навакольным, што я не лыкам шытая і змагу дасягнуць пастаўленай мэты.

Працоўнае месца шукала праз інтэрнэт. Дапамог сайт БРСМ, дзе ў раздзеле "Праца" быў змешчаны спіс дзіцячых аздараўленчых лагераў, якім патрабаваліся студэнты ў якасці выхавацеляў. Я адправіла па электроннай пошце сваё рэзюмэ ў некалькі раённых камітэтаў БРСМ. У выніку мяне запрасілі на працу ў лагер "Нёман", што знаходзіцца побач з вёскай Каўшова ў Мастоўскім раёне Гродзенскай вобласці.

Выхавацельскі калектыў сабралі ў лагеры за дзень да пачатку змены. Тады я і высветліла, што працаваць мне давядзецца побач са студэнтамі-педагогамі і маладымі спецыялістамі, якія толькі пачалі свой настаўніцкі шлях. Напрыканцы першай "планёркі" дырэктар лагера Алена Францаўна Лючык сказала вельмі трапныя словы: "Будзьце пільнымі! І не забывайце, што вольны час у вас будзе толькі пасля адбою і да пад'ёму дзяцей". На справе так і атрымалася.

У мае абавязкі ўваходзіла праца з дзецьмі ў атрадах тады, калі ў іх выхавацеляў былі выхадныя, і падрыхтоўка некалькіх мерапрыемстваў. У цэлым, за 18 дзён я паспела прымераць на сябе вельмі розныя ролі. Для самых маленькіх дзетак прыйшлося быць маці, для падлеткаў – старэйшай сястрой, а на рэпетыцыях канцэртаў – аб'ектыўным крытыкам. Але пра ўсё па парадку.

Ужо ў першы дзень змены мы разам з калегамі сутыкнуліся з першымі цяжкасцямі. Дзеці ўсіх узростаў былі не зацікаўленыя ні ў чым, акрамя сваіх смартфонаў і планшэтаў. У 2015 годзе гэта не дзіўна, тым больш, калі нават ты, выхавацель, трымаеш у руцэ гаджэт. "Станьце прыкладам", - успомнілася мне не то з рэкламы, не то са школы. Я ўзяла мяч і разам з адной дзяўчынкай пайшла на валейбольную пляцоўку, праз 10 хвілін да нас далучыліся яшчэ некалькі чалавек, пра паўгадзіны падышлі яшчэ. Гэта была хоць маленькая, але перамога!

Увогуле, быць прыкладам для дзяцей даводзілася пастаянна. У тваім пакоі чыста – і дзеці імкнуцца навесці парадак, ты з'ядаеш у сталовай усё – і дзеці паказваюць табе пустыя талеркі, ты на "ціхай" гадзіне спіш – і яны засынаюць.

Летні лагер для многіх дзяцей – месца, дзе яны ўпершыню могуць адчуць сябе самастойнымі. Але ў большасці выпадкаў дзеці да яе не гатовыя. Менавіта выхавацель сочыць за тым, каб усе 25 выхаванцаў ранкам пачысцілі зубы, увечары памылі ногі; дзяўчынкам абавязкова трэба рабіць прычоскі. А калі ўзнікае неабходнасць, ты павінен памыць дзіцячую бялізну. Пра гідлівасць і стомленасць забудзьце. Да таго ж дзеці ўсё адчуваюць, яны заўважаюць кожную дробязь. Аднойчы, калі я працавала на атрадзе самых маленькіх, перад адбоем да мяне падышоў хлопчык Юра Дубатоўка і спытаў: "А колькі ў вас дзяцей? Вы клапоціцеся пра нас так, нібыта мы вашы, родныя..." Напэўна, гэта было самае нечаканае і ў той жа момант самае прыемнае, што мне даводзілася пачуць ад дзіцяці.

Кажуць, што калі ты педагог, дык да ўсіх дзяцей павінен ставіцца аднолькава, але я зразумела, што гэта немагчыма хаця б таму, што ўсе дзеці розныя. Так, напрыклад, самая цеснае сяброўства ў мяне завязалася з Захарам Маркачэнкам з апякунскай сям'і. Хлопчык прыехаў у "Нёман" ужо трэці раз, і супрацоўнікі лагера папярэдзілі выхавацеляў, што з ім будзе няпроста. І сапраўды, васьмігадовы Захар толькі і рабіў, што адбіваўся ад калектыву: калі ўсе ішлі на мерапрыемства, ён збягаў на арэлі, падчас дыскатэкі сядзеў у альтанцы. Такім паводзінам я знайшла толькі адно тлумачэнне – патрабуе ўвагі да сябе. Нічога не заставалася, акрамя як даць яе Захару. Мы заклікалі хлопчыка да ўдзелу ва ўсіх магчымых гульнях і спаборніцтвах і нават не заўважылі, што праз некаторы час ужо не маглі без яго абыходзіцца.

Змена доўжылася толькі 18 дзён, а мне здаецца, што я паспела пражыць маленькае асобнае жыццё. Побач з дзецьмі атрымалася не толькі ўспомніць, як гэта быць бесклапотнай, але і зразумець, што такое сапраўдная адказнасць за кагосьці, акрамя сябе. І няхай у мяне няма педагагічнай адукацыі, спадзяюся, што дзеці змаглі ад мяне чаму-небудзь навучыцца. Бо, як казаў знакаміты пісьменнік і педагог Антон Макарэнка: "Выхаванне ў тым і заключаецца, што больш дарослае пакаленне перадае свой досвед, сваю жарсць, свае перакананні маладшаму пакаленню". Думаю, гэта справядліва.

**Г.КУРАК,
студэнтка III курса Інстытута журналістыкі БДУ
Фота аўтара**

# В мире сказочного детства








Хорошая новость

**В город Мосты приехал лунопарк из Чехии. Детишкам - радость, а взрослым - приятная возможность отдохнуть в парке представится до второго августа.**

Каждое лето к нам приезжает целый город аттракционов, даря счастье и радостное время катания на любимых каруселях. Эмоций хватит на всех!

А кто не любит аттракционы? Если детей в парке развлечений безудержно влекут яркие и безобидные карусели, то старшее поколение этим не удивишь. Взрослого человека интересуют острые ощущения и новые технологические изыски. Карусели приготовили для жителей города не только детские удовольствия, но и аттракционы для тех, кто желает пощекотать нервишки.

Мостовчан ждут аттракционы от ветерка до комнаты страха, от паровозика до «центрифуги». Иными словами, каждый найдёт развлечение по душе. И даже те, кто ещё не получил водительское удостоверение, сможет от души поездить на автодроме.

-- Мы путешествуем по всей Беларуси. Большей популярностью пользуются такие города, как Гродно, Брест и области. В Мостах уже бывали ранее. Подготовили яркие и незабываемые развлечения для горожан, - поделились сотрудники лунопарка. Осталось всего два дня нашего пребывания в городе. Надеемся, что многие дети прокатятся на каруселях.

**А. МАКАР
Фото автора**




**ДОРОГАЯ И ЛЮБИМАЯ МАМОЧКА, ТЁЩА И БАБУШКА МАРИЯ ПЕТРОВНА ГЕЦОЛЬД!**

Поздравляем с юбилеем!

*Мама дорогая, мы тебя так любим!
Руки твои нежные, добрые глаза,
С нежностью сегодня мы тебя целуем,
Ведь любовь словами выразить нельзя.
Радостей тебе земных желаем,
Много счастья, света и добра,
И пускай с теченьем лет, родная,
Твои внуки радуют тебя.
Не грусти, что волосы седеют,
Береги себя и не болей,
Потому что нет на целом свете
Человека ближе и родней!*

С любовью и уважением дочь Рената, зять Юрий, внуки Мария и Александр

**УВАЖАЕМЫЙ ИЛЬЯ НИКОЛАЕВИЧ ГЕРМОСЬ!**

*Мы Вас хотим поздравить
с днём рожденья
И пожелать счастливых долгих лет,
Любовь пусть кружит до забвенья
И сил даёт встречать рассвет!
Пусть каждый день удачлив будет
В работе, бизнесе, труде!
И пыл задорный не остудит,
Вот так никто, никак, нигде!
Хотим, чтоб сил у Вас хватало
На каждый жизненный этап!
Пусть лучше много, а немало,
Чтоб охватить мечты масштаб!*

Коллектив работников ГУО «Песковский учебно-педагогический комплекс детский сад-средняя школа»



**ДОРОГОГО И ЛЮБИМОГО СЫНА, БРАТА И ВНУКА ДМИТРИЯ ЮРЬЕВИЧА ЗДАНОВИЧА**

от всей души поздравляем с 18-летием!

*Вот уже в восемнадцатый раз
Поздравляем тебя с днём рожденья.
Ты уже не ребёнок сейчас,
К взрослой жизни готовься скорее.
Пожелаем терпенья тебе
По дороге к мечте и желаньям,
Только счастья желаем в судьбе,
Пусть не будет в ней места страданьям!*

С любовью мама, сестра с семьёй, бабушка

**УВАЖАЕМЫЙ СЕРГЕЙ МИХАЙЛОВИЧ БОЛТРУКЕВИЧ!**

Поздравляем с юбилеем!

*Пусть будет добрым каждый час,
Прекрасным настроенье,
Пусть повторятся много раз
Счастливые мгновенья!
Пусть дарит жизнь любовь и свет,
Надежду и везенье!
Желаем счастья, долгих лет,
Удач и вдохновенья!*

С уважением Екатерина и Дмитрий

**ДОРОГОЙ, ЛЮБИМЫЙ МУЖ И ПАПОЧКА АЛЕКСАНДР НИКОЛАЕВИЧ ЧУПИН!**

В этот день прими наши самые искренние поздравления с юбилеем!

*У тебя день рожденье,
А ещё при этом -- юбилей,
Так прими же поздравленье
От родных тебе людей.
Для нас нет в мире человека
Дороже и родней тебя,
Так пусть же согревают дольше
Твои любовь, забота, доброта.
От всей души, без многословья,
Желаем счастья и здоровья,
Таким же милым, добрым быть,
На радость нам 100 лет прожить!
Желаем благ тебе земных,
Мы знаем: ты достоин их!*

Твои самые родные -- жена и дочь

Поздравляем

**СВОЮ ЛЮБИМУЮ ДОЧЕНЬКУ, МАМОЧКУ И СЕСТРИЧКУ ИННУ СТАНИСЛАВОВНУ СИДОРОВИЧ**

с днём рождения!

*У тебя сегодня юбилей,
Пусть станет на душе светлей
От наших слов и пожеланий!
Столько всего в жизни бывало:
Была и радость, была и беда.
Пусть солнце светит тебе всегда,
А век твой до сотни лет продлится,
И навсегда отступит то, что тебя тревожит,
И счастливая звезда без горя
Жизнь прожить поможет!*

Мама, папа, доченьки и все родные, Урбановичи

**УВАЖАЕМАЯ ОЛЬГА АЛЕКСЕЕВНА ПАНАСИК!**

*Вас с юбилеем поздравляем
И счастья женского желаем,
Здоровья, радости, успеха,
Побольше юмора и смеха!
Ещё для счастья что Вам надо?
Любви, тепла и шоколада,
И Вашей женской красотой
Пусть восхищается любой.
И напоследок Вам везения,
Добра, удачи, долгих лет,
Во всём Вам удовлетворения --
А в этом счастья весь секрет!*

С уважением коллектив работников торгового отдела Мостовского филиала ГОПО

**УВАЖАЕМАЯ ТАТЬЯНА АЛЕКСАНДРОВНА СИМОНЧИК!**

Поздравляем Вас с днём рождения!

*Желаем, чтоб люди ценили Вас,
Родные, чтоб Вами гордились,
Чтоб жизнь молодая цвела и цвела,
И годы, чтоб счастливо длились!*

Коллектив работников Мостовского РОВД

**ДОРОГАЯ МАМА, СВЕКРОВЬ, БАБУШКА МАРИЯ ПЕТРОВНА ГЕЦОЛЬД!**

Поздравляем с юбилеем!

*Милая, хорошая, родная,
Не грусти сегодня о годах.
Ты для нас такая молодая,
Даже с серебринкой в волосах.
Нам твои морщинки не заметны,
И для нас тебя красивей нет,
Будь же ты красивой и заветной
Ещё много-много долгих лет!*

С любовью сын, невестка, внучки и их семьи

**ДОРОГОГО И ЛЮБИМОГО БРАТА И ДЯДЮ АЛЕКСАНДРА НИКОЛАЕВИЧА ЧУПИНА**

поздравляем с юбилеем!

*Юбилей - это праздник большой,
Это очень серьёзное дело!
Мы желаем не гаснуть душой,
Чтобы радостью сердце горело.
Интересно и счастливо жить,
С огоньком, вдохновеньем и смехом,
И примером своим всех учить,
Оптимизму, добру и успеху!*

Любящие тебя сестра Тамара и её семья

# Як сляза дзіцяці...



Народная пагалоска сцвярджае, што ў Русінаўцах -- самая чыстая на Мастоўшчыне вада, што ў вёску прыязджаюць набраць яе людзі з розных мясцовасцей нашага і суседніх раёнаў.

-- Ці так гэта? -- запыталі мы ў кіраўніка філіяла "Дубна" В. А. Пуся, вяртаючыся з поля, дзе камбайны ўбіралі зерневыя культуры.

-- Такі факт мае месца, -- адзначыў Валерый Аляксандравіч. – Я сам ў Русінаўцах набіраю ваду для загатовак на зіму. Яна па ўсіх аналізах самая чыстая. Справа ў тым, што ў гэтым месцы на значнай глыбіні знаходзіцца падземнае возера, куды не могуць пранікнуць розныя прымесі. Ваданапорную вежу і калонку тут дапамог устанавіць былы старшыня райвыканкама А. Р. Кісялёў па просьбе мясцовых жыхароў.

Сапраўды, чыстая вада з глыбіні – не з калодзежаў, якія харчуюць паверхневыя воды. Мясцовыя жыхары задаволены такім фактам і ганарацца ім, добразычліва адносяцца да тых, хто прыязджае па ваду. Ля калонкі мы са старшынёй райкома галіновага прафсаюза В. М. Мятлюком знайшлі чысты кубачак і з задавальненнем у летнюю гарачыню папілі чыстай і халаднаватай русінаўскай вады.

**С. ЗВЯРОВІЧ**
**Фота аўтара**

Галоўны рэдактар Станіслаў Рышардавіч ЗВЯРОВІЧ

Зара над Нёманам
Мастоўская раённая газета.
Газета выходзіць у сераду і суботу.
У тыдзень выпускаецца два нумары.
Выдаецца ў г.Масты, Гродзенскай вобласці, Рэспубліцы Беларусь.
Заснавальнікі: раённы выканаўчы камітэт, раённы Савет дэпутатаў, працоўны калектыў рэдакцыі.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №1214.
Выдадзена 8 лютага 2010 года Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 231600, г.Масты, вул.Савецкая,34 Індэкс 64033

ТЭЛЕФОНЫ: галоўнага рэдактара --3-21-65, нам. гал. рэдактара -- 3-24-33, адк. сакратара -- 3-22-29, аддзела пісьмаў-- 3-33-45, аддзела сац.-эканамічнага развіцця -- 3-35-85, бухгалтэрыі і аддзела рэкламы -- 3-35-23, камп'ютарнага цэнтра -- 3-23-17, аддзела радыёвяшчання -- 6-13-57.

ISSN 2218-919X

Наш сайт у інтэрнэце: http: //www.mosty-zara.by

E-mail: zarja@mail. grodno. by

Набор і вёрстка камп'ютарнага цэнтра "Зары над Нёманам"
Газета надрукавана афсетным спосабам у ГАУПП "Гродзенская друкарня": 230003, г.Гродна, 3, вул. Паліграфістаў, 4. Разл.рахунак рэдакцыі №3015240090011, РКЦ №10 у горадзе Масты філіяла ААТ «Белаграпрамбанк» -Гродзенскае абласное ўпраўленне, код банка 457, УНП 500126806, ОКПО 02478504.
Падпісана да друку 31 ліпеня ў 10.00. Тыр. 4193 Зак. 4401

Адказнасць за падбор і выкладанне фактаў нясуць аўтары публікацый. Выказаныя ў іх думкі могуць не супадаць з пунктам гледжання рэдакцыі і не накладваюць на яе ніякіх абавязкаў.
За змест аб'яў і іншай рэкламы рэдакцыя не адказвае. Усе даведкі ў рэкламадаўцаў.